# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

3 студзеня 2019 г. № 2 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне тэатральнага, музычнага, эстраднага мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2018 года:

калектыву дзяржаўнай установы ”Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ”Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь“ – за выдатныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, рэалізацыю ў 2017 – 2018 гадах патрыятычнага творчага праекта ”Айчыне служым“;

калектыву дзяржаўнай установы ”Пастаўскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва“ – за значны ўклад у развіццё аматарскай мастацкай творчасці пажылых людзей і людзей з абмежаванымі магчымасцямі, актыўную гуманітарную і дабрачынную дзейнасць, захаванне рэгіянальных духоўных і культурных традыцый;

калектыву ўстановы адукацыі ”Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж“ – за выдатныя дасягненні ў навучанні і выхаванні творчай моладзі, значны ўклад у развіццё нацыянальнай школы класічнага танца і правядзенне дабрачынных праектаў ”Творчасць юных – роднай Беларусі“, ”Дзеці дзецям“, ”І памятае свет выратаваны“;

Манаеву Віктару Сяргеевічу, вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай установы ”Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы“, народнаму артысту Беларусі, – за высокае прафесійнае майстэрства, значныя дасягненні ў галіне тэатральнага мастацтва, стварэнне ў тэатральным сезоне 2017/2018 года вострахарактарных вобразаў у спектаклях ”Рэвізор“ і ”Школа падаткаплацельшчыкаў“;

калектыву народнага сямейнага ансамбля ”Сваякі“ філіяла ”Дом культуры аграгарадка Юбілейны“ дзяржаўнай установы культуры ”Ваўкавыскі

раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці“ – за захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускіх традыцый сямейнай аматарскай творчасці, арганізацыю і правядзенне фестывалю-конкурсу творчых сямейных дынастый ”Сваякі запрашаюць“;

аўтарскаму калектыву Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў складзе Камадзея Сяргея Юр’евіча, начальніка ўпраўлення па распрацоўцы і рэалізацыі спецыяльных праектаў галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Голубевай Алены Уладзіміраўны, намесніка начальніка ўпраўлення па распрацоўцы і рэалізацыі спецыяльных праектаў галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Кандратовіч Наталлі Леанідаўны, старшыні Ганцавіцкага раённага аб’яднання арганізацый прафсаюзаў, – за выдатныя дасягненні ў галіне эстраднага мастацтва і правядзенне ў 2018 годзе цыкла канцэртаў рэспубліканскай народна-патрыятычнай акцыі ”Мы – разам!“, прымеркаваных да Года малой радзімы;

творчаму калектыву былых малалетніх вязняў фашызму ”Лёсы“ – за значныя дасягненні ў справе захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, патрыятычнае выхаванне моладзі, годнае прадстаўленне Рэспублікі Беларусь у ходзе правядзення акцыі ”Не фашызму! Дзяцінства без вайны!“;

народнаму інструментальнаму ансамблю ”Нясвіжскія лыжкары“ дзяржаўнай установы культуры ”Нясвіжскі раённы цэнтр культуры“ – за значны ўклад у папулярызацыю музычнага мастацтва, мэтанакіраваную работу па эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення, актыўную канцэртную дзейнасць;

Васілевіч Марыі Віктараўне, магістранту Інстытута магістарскай падрыхтоўкі ўстановы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт“, уладальніцы тытулаў ”Міс Беларусь – 2018“ і ”Міс свету Еўропа“, – за значны ўклад у развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, актыўную дабрачынную дзейнасць.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2018 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ * 1 *
Для правовых актов

10